Перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны Марат Казей паспеў скончыць толькі чатыры класы. У гады Вялікай Айчыннай вайны, калі маці Марата Казея, сувязную партызанскага атрада, схапілі і павесілі фашысты, Марат разам з сястрой Арыяднай пайшоў у партызанскі атрад. Стаў разведчыкам. Прабіраўся ў фашысцкія гарнізоны і сачыў, дзе знаходзяцца варожыя пасты́, штабы́, склады са зброяй. Гэтыя звесткі дапамагалі партызанам наносіць вялікія страты фашыстам. У маі 1944 года ў вёску, куды быў накіраваны ў разведку Марат, уварваліся карнікі. Яны адкрылі агонь па разведчыку, забілі пад ім каня. Юны партызан залёг у хмызняку і адстрэльваўся да апошняга патрона. Потым гранатай падарваў сябе і знішчыў некалькі гітлераўцаў.



*Марат Казей*

Марату Казею было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У 1959 годзе на сродкі піянераў рэспублікі ў Мінску пастаўлены помнік Марату Казею.

## Клятва Марата Казея

*Мікола Чарняўскі*

Як напаў на нас вораг знянацку —
Ад крыві пабарвеў далягляд.
За Радзіму, за маці, за бацьку
Мужна помсціць пакляўся Марат.

«Я адпомшчу!» — пачулі бярозкі.
«Я адпомшчу!» — пачулі бары.
І панеслі ад вёскі да вёскі
Гэту клятву Марата сябры.

Ды бяда ўсё ж сустрэла Марата —
У засаду патрапіў Марат.
Адбіваўся хлапчына заўзята,
Ды раптоўна заціх аўтамат.

Сонца промень крывавай палоскай
У вачах мільгануў, пацямнеў...
Затуліць не паспелі бярозкі,
Родны бор засланіць не паспеў.

Абступілі чужынцы Марата —
Да сваіх не прабіцца ўжо, не!
Хоць патронаў няма, ёсць граната:
— Падыходзьце, бярыце мяне!

І ўзняўся, на карнікаў рушыў,
Гневам помсты — граната ў руках!..
Не, ён клятвы сваёй не парушыў —
І застаўся жывым у вяках!

1. Які настрой выклікаў у вас гэты верш? Патлумачце.
2. Што прымусіла Марата помсціць ворагу?
3. Чаму юнак не здаўся ў палон? Якія якасці характару выяўляюцца ў героя?
4. Як вы разумееце выраз «і застаўся жывым у вяках»?
5. Чаму, на вашу думку, паэт вырашыў расказаць нам пра Марата Казея і яго подзвіг?



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

6. Ці адрозніваюцца факты пра подзвіг героя ў вершы ад інфармацыі пра Марата Казея, змешчанай на с. 94? Дакажыце.
7. Праілюструйце твор вусна.
8. Падрыхтуйце выразнае чытанне верша.

Дзень Перамогі — 9 Мая — свяшчэннае свята для беларусаў. Гэта дзень памяці, глыбокай павагі да ўсіх, хто набліжаў Перамогу, і ўдзячнасці. Аб ахвярах вайны і подзвігу народа сведчаць шматлікія абеліскі, помнікі, мемарыяльныя комплексы. Наш абавязак — свята захоўваць памяць аб гераізме нашага народа, каб зберагчы мір і ўмацаваць нашу краіну.




1. Разгледзьце фотаздымак помніка.

2. Адкажыце на пытанні.

1) Які момант з жыцця Марата Казея адлюстраваў скульптар Сяргей Селіханаў? Знайдзіце і прачытайце адпаведныя радкі з твора М. Чарняўскага «Клятва Марата Казея».

2) З якой мэтай, на вашу думку, створаны і ўстаноўлены гэты помнік?

**Абелі́ск** — помнік у гонар якой-небудзь падзеі ў выглядзе гранёнага каменнага слупа, звужанага ўверсе.

## А хіба ёсць, што забываюць?

*Пятрусь Броўка*

Ляжыць салдат ля пераправы,
Каля маленькае ракі.
Ляжыць салдат
Вялікай славы,
Крывёй здабытай на вякі.

Шуміць над ім гушчар зялёны,
Плывуць аблокаў караблі.
Ён паў,
Пазбавіўшы палону
Вось гэты кут сваёй зямлі:



І лес ва ўзорах журавінных,
І луг з рася́наю травой,
І тыя светлыя хаціны,
Што сталі дружна над вадой.
І сад, шумлівы напрадвесні,
І піянерскія кастры...

Ляжыць салдат
І чуе песні,
Што не сціхаюць да зары.

Ляжыць і сніць ён аб народзе,
Якому шчасце — вольна жыць!



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

І рады ён, калі прыходзяць
Хоць зрэдку з ім пагаварыць,
Калі сцяжыначка малая
Не зарастае да яго...

А хіба ёсць, што забываюць
Выратавальніка свайго?

?

1. Якія пачуцці і думкі выклікаў у вас верш?
2. За які кут зямлі змагаўся і загінуў салдат? Прачытайце адпаведныя радкі з твора.
3. Якімі словамі аўтар перадае хараство гэтага кута? Прачытайце іх.
4. Выберыце з прапанаванага пераліку тэм тую, якой прысвечаны твор:
   а) подзвіг у гады Вялікай Айчыннай вайны;
   б) прырода ля абеліска;
   в) героі вайны ў памяці народнай;
   г) шчасце народа ў мірны час;
   д) барацьба з ворагам.
5. Пра што прымушае нас задумацца П. Броўка?
6. Што адказалі б вы на пытанне, якое змяшчаецца ў апошніх радках верша?
7. Чаму важна памятаць пра воінаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны?
8. Разгледзьце ілюстрацыю да твора. Ці адпавядае яна зместу? Чаму?
9. Выразна прачытайце верш. Вызначце, хто з вучняў класа найлепш справіўся з заданнем.